АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

ПОЭМА
ІМЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Заказ № 875. 5.000 экз. ($1^1/_2$ арк.). Галоўлітбел № 2308.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

АГЛЯД
ПАЧЫНАЮ
ЗА ДЗЕСЯЦЬ ГОД
ТАК ЗВАНАГА
КРАЮ
ЛЯСОЎ І БАЛОТ.

1

Лёзунгаў мітынг
ў акопы
бег—
з візай культпропа
ЦК КПБ

Лёзунг—
        грозны
        кліч-плякат.
Лёзунгамі пачынаю
генэральны агляд.

№ а.

Шчыльней пролетарскія рады,—
Даеш пяцігодку ў чатыры гады!

№ б.

Узброім трактарамі колгасы,
ліквідуем кулацтва як клясу!

№ в.

На лом заржавелыя краты—
гора-тэорыяў нац. дэмократаў!

№ г.

Сырая вада—
атруты шкадней,
як шовінізм усіх масьцей.

№ д.

Будаўніцтва жывыя лічбы
складзены, як Ільліч быў.

Штодзень над краем кліч бег—
жыве Ільліч
у жывой лічбе.

2

Бяз схватак сэнсацый,
бяз сіплых слоў
бюро рэгістрацый
гісторыі чало
аздобіла датай
надзвычайнага сьвятла:
Вызваленьня год дзесяты.

3

Урачыстасьць
          стальлю сочыцца,
каб над краем
          датай выліцца—
каму хочацца,
і ня хочацца,
і лацінікай,
і кірыліцай,
і на Захад,
і на Ўсход—
                    Будаўніцтва дзесяць год!

4

На рыштаваньнях
сонцаўсход
віталі,
штораньне—
— Дзесяць год.
А ў 10 год
закон—
3600
дзён.

5

Беларусь у Янкі Купалы
безназоўнаю векавала.

А ў Якуба Коласа
і пазбаўленая права голасу.

У Бядулі—бядой бедавала.
У Гартнага—ледзь бунтавала.

А выйшла—
        безназоўная і безгалосая
па Чароту на вогнішча босая.

Па Александровічу Андрэю
ахрысьцілася ў завеях
                і цяпер завецца
                Беларусьсю Савецкай.

6

Было-бывала...
(Вока
глыбей кінь!)
На кожным кроку:
цымбалы,
дудкі
і жалейкі.

Песьні жальбы,
гусьляры...
Край пакутуе.

Жах—
жаль быў.
Земляры:
пот
працы
лютае.

Ґне з берагоў гнеў,—
і ў завірусе—
радзіў новы сьпеў
Новай Беларусі.

7

Беларусь была арэнай
векапомных схватак.

Пілсудзкага выгналі
каленам
пролетарыяту.

І яшчэ нямала
быў стан біты:
панавала
банда
наймітаў-бандытаў.

Беларусь была экранам,
дзе наплывам,
буйным плянам
наплывала ўся жахлівасьць
панаваньня пана.

Сьцяўшы вякоў пятлю—
убачыла краіна:
рабочыя рукі,
уямлю
і на зямлі
руіны.

8

Было-бывала
градам
протэставала
Рада:
        О, божа, як пасьмелі
        пасады
        і портфэлі
        браць
                на штыкі—
        бальшавікі!

Самі
хоць з вусамі,
толькі
мала толку.

Разьбітыя пагрозай,
што Рады
            біты
                козыр—

давай лізаць аравай
Пілсудзкага халявы.

Кайзаравы пяткі—
каб навёў парадкі.

9

Напорам войск чырвоных
павыганялі вон іх.

Замоўклі крыкі, рэхам стрэла,
бела-чырвань-белых.

Бывае, хмара асядае,
як заслона дымавая—
іх краіна ўспамінае.

Хоць яны далёка і
з міністраў
сталі
лёкаі.

10

Ня ўсе, што з Рады
зьбеглі за мяжу.
Дзеля праўды
даскажу.

Іх і ў нас—
не пералічыць.

Як сычы—
якраз,
глядзяць на нас.

І знойдуць момант
выйсьці з дому—
на вуліцу—
на барыкады—
супроць савецкае ўлады.
Адным словам,
ідэолёгія Рады
і савецкія чырвонцы.
Мая парада:
прачытайце
„Цені на сонцы".

11

Белых арлоў страі
стрыножвалі гарады:
душыў на вуліцах дым—
стогн гарадзкіх руін.

Братоў і сясьцёр зьбяром мы
ахвяры жандарскіх пагромаў.

Плачуць, як дзеці, хвалі
на развалінах мастоў.
Забінтоўвае нас зноў
упартасьць—упорысьцей сталі.

Руін у крыві камень,
— будзем бальшавікамі.

Пад сьцяг барацьбы аднаўленьня
выйшлі рабочыя сотні.
Першым на першы суботнік
выйшаў таварыш Ленін.

І сэрца фабрычных кварталаў
песьняй машын ажывала.

13

Галавой павісла
высахшая Сьвіслач.

Ход
вод
дзе ён?
сталіца чырванее.

Бяроза гулам
вод—
адамкнула
сход.

Дняпро віхрыста ўсыпенены
ўрачыста
славіў Леніна.

Дзьвіны віталі
хвалі нас
палітыкаю Сталіна.

Плаўнакрылы
Сож прабег
уславіць сілы
КПБ.

Прыбег на пераклічку
і Нёман прыгранічны.

Змагла краіна сьлед знайсьці—
сьвяткуе сьвята еднасьці.

14

Мільёнам заяўляю
сёньня я:
была-б векавая
Беларусь-колёнія.

Каб ня ўздыблены наш гарт—
мела-б губэрнскі пашпарт.

Савецкага Саюзу ня было каб—
была-б заплесьненай затокай.

І славілася-б на Эўропу
сельтэрскай вадою з сыропам.

Але сёньня—
выроўнівай стан ты!
Мы маем
імя ім—
гіганты!

І чаго было-б варта
каб ня было
ў Беларусі компартыі?!

15

Супроць—
прарываў,
прагулаў
і браку.

За—
промфінплян
і высокую якасьць.

Таварыш—рабочы,
Таварыш—араты—
з заводу,
з колгасу
гані бюрократа.

Мільёны краіне дае
без замінкі—
савецкая бесьперапынка.

16

Яшчэ ўчора танулі
ў раскопаных пятах вуліц.

Давялося зямлі расьці
на вуснах сталічнай цярплівасьці.

Горад, як труп быў.
Клалі-перакладвалі трубы...

Зьдзекваліся нават і дзеці:
— Выкідваюць грошы
ў зямлю,
калі трэба
на вецер.

І лаялі іх за
гэтую каналіза...

...Засыпалі трубы ў ямы.
Пусьцілі па вуліцы
электро-трамы.

І рэйкі і трубы ў рух загулі
і пад зямлёю і на зямлі.

17

Разьлівала
песьні
шыр балот Палескіх,
зазывала
зьдзейсьніць
песьні
хваль Арэсы.
Зазывала-звала
пракапаць каналы.

Як ні дзе на сьвеце
ў Ленінскім сталецьці.

Балоты, як акопы
капаюць землякопы.

Закасаўшы ногі—
за новыя дарогі!

Рукі закасаўшы
за перамогі нашы!

Штурмуюць агрономы...
— Ваду ў канал зьбяром мы!

Досыць суму сейбіты—
прыдзецца за сеў біцца.

Ня зьвісай чало ніцам,
ураджай паклоніцца.

18

Па самакату
бервяно
ідзе пад нож
варштату.

З лесапілкі—
веерам
апілкі.

Па конвэеру
з парылкі
зноў альховыя
кражы
кладуць
пад новыя
нажы.

Істужкай шэрай,
як тканіна—
йдзе фанэра
праз машыну.

Роўнамерна
б'е вал люта:
— не фанэра,
а валюта!

Працы бег
не адстае:
суседні цэх —
сваё пяе...

Гудуць валы:
— Складай сталы.

І міма ходам:
— Ёсьць камода.

І... ў міг
шкаф для кніг.

Звыш програмы—
вокнам рамы.

Быстрагонам
пад вагоны
груз падвёз
аўтовоз.

Машыністаму нарад
даў
Бабруйскі комбінат.

19

Змрок гісторыі
штовечар
запальваў сузор'е,
як сьвечы.
Закурылася краіна
і ад звычайнае лучыны.

Чалавека вякамі
працы нялюдзкае пот
скручваў,
як ланцугамі—
калючы
дрот.

Поступам шквала
ўсім краем
паўстала
навала
людзкая.
Заве, каб
чалавекам
і ў дрыгве
стаў чалавек!

І пайшло так...
У балотах
загула была
работа.

І праз год
сярод
балот—
пе-
ра-
ва-
рот!

Тысяча
дзевяцьсот
трыццаты
год.
З балот
у гарады
пабеглі правады.
Загудзелі поўным ходам
гмахі фабрык і заводаў.

І ў селяніна
замест лучыны
і карча—
лямпачка Ільліча...

Абвязаў краіне стан
правадамі—
Сталінстан.

20

Іграйце
маршы
заўтрашняму дню.

Жыцьцё
наша
агнявей агню!

Нашаніўцы
і ў сьне ня сьнілі,
што мы ў Беларусі
зрабілі.

Зналі
адно—
ткалі
валакно.
А час прышоў
мы робім шоўк.

Роспачным крыкам
магілы
рыла—
рылам
саха-матыка.
Цяпер над краем
крыляе
звонам—
гонар
трактарнай колёны.
І пяе наўсьцяж
наш
Сельмаш.

На небе хмаркі,
што фальваркі,
з бандай зор
вялі згавор:
— „жыцьця разьбег
скарыць сабе!“

І хутары
да гэтых пор
на зямлі
вялі
згавор.
Зьвязаўшы моц сваю вузлом,—
бліскавіца
быццам
нож—

нанесла ўдар
па зграі хмар—
і грымнуў гром,
і лінуў дождж!..

Сабе
хутары
ў барацьбе
пакарыў
і ў нас—
колгас.

21

1900 і 17 зім
краіна была
няпісьменнай зусім.

Тры крыжыкі—спадчына
з даўных вякоў.
(Таму і так многа
ў краіне крыжоў!)

Прывязалі
дні на палях
і ў навале
далі
бой.

Забінтавалі
стальлю
стыннай
стан краіны
маладой.

Пакарылі,
як на крыльлях,
дзён нязьлічаныя мілі.

Уздыхнулі
гулкім вульлем!
Дасягнулі
сілай рук—
ад вяскова - пачатковай
да Акадэміі Навук!

22

На біржах працы ў нас няма
майстроў, якіх варштат баіцца.
Рабочых рук, як быццам, шмат,
а не стае ў завеі будаўніцтва.
Крыляйся рух!
Мы ўдаль ідзем!..
Адзін за двух—
ударны тэмп!
Перамога
ў грудзі б'ецца:
з бальшавіцкім
зьліцца
сэрцам
. . . .
Агляд закончу праз адну
найболей дзьве ўрачыстых песьні.
Міжнароднае становішча—крануць—
чаму
жаданьне гэтае
я зьдзейсьніць?

23

23 гадзіны...

Сілай нястрыманай,
як ветрарэз,
крануўся ў даль
экспрэс.

> ...Увага!
> Будучыня вабіць.
> Падзея ў плянэтным маштабе.
> Зьвяжамся поясам рэк
> аднэю пад сонцам ідэяй.

Але праз гадзіну
ў 24—
касьцьмі ляглі пасажыры.
Выбух!
Крушэньне!
Экспрэс у попел.

. . . .

Таварышы, ціха!
Крушэньне ў Эўропе!

. . . .

Крушэньня (на жаль!) ня было...
Гэта толькі... паніка слоў.
Яшчэ ня было...
Але-ж будзе яно—
рэволюцыя зьменіць
жыцьця старно!
Раскатамі чуюцца зрухі
гісторыі Заўтрага...
Слухай:

Паясьніцу
краю
разьядае
як іржа—
вераніцаю
мяжа.
Казэматы,
зьдзекі,
плаха.
Векі
катам
жмурыць Захад.

Беражы
замок мяжы!
І хрыстос
вайной
на нас—
мобілізованы
ў проціваагаз!

Эўропа
ў акопах!
Што дзень,—так і
бліяцца схваткі атакі!

...Зазьзяе сонцам Сталінстан
там—
над краем катаржан!

24

Краіна набыла
жалезную закалку.
Расла прымежная
ў разьбежнай барацьбе.
Ухваляем
поўнасьцю і цалкам
генэральную
лінію
КПБ.

Не любавацца
тым—
што маем.
Нашай працы
наш уздым
гады пераступае!
Ўвысь галава!
Раз, два!
Будзе садам расьці
песьня радасьці.

І як бор расьці
песьня гордасьці.

25

На варту дні ліпнёвыя
к нам новыя прышлі.
Мінулыя, суровыя
падмуркамі ляглі.

Жыцьцё агнём завеена,
як зарывам усход.
Сягоньня жыць заве яно
на ўсе, на дзесяць год!

Жылі мы бедна ў горы—і
змаглі залом зламаць!

Калісь была ў гісторыі
расійская турма...

Жыцьця законы зьменены
турмы прайшла пара.
Пад гордым сьцягам Леніна
у людзі выйшаў край.

Была няхай крывавую
і не адна вярста,—
Савецкаю Дзяржаваю
Край вызвалены стаў.

Узьвіцеся імкненьні!
Зерне шчасьця сей—
Поэма Вызваленьня
Беларускай
ССР.

Май—Чэрвень
1930 год.